Навіны тваёй Alma Mater

Настаўнік

Выдаецца з кастрычніка 1972 г. Серада, 1 верасня 2021 года № 10 (1264)

• Афіцыйная хроніка

ПЕДСАВЕТ НАЙВЫШЭЙШАГА ЎЗРОЎНЮ



Дэлегацыя БДПУ на чале з рэктарам універсітэта **А.І. Жуком** прыняла ўдзел у Рэспубліканскім педагагічным савеце — самым маштабным і значным форуме работнікаў сістэмы адукацыі краіны. У пленарным пасяджэнні перад удзельнікамі мерапрыемства — педагогамі, кіраўнікамі ўстаноў адукацыі, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама прадстаўнікамі грамадскіх аб'яднанняў і галіновага прафсаюза — выступіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь **Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка**.

У першы дзень працы форуму, 23 жніўня, наш універсітэт стаў месцам правядзення трох дыялогавых пляцовак, прысвечаных падрыхтоўцы педагагічных кадраў, пытанням дашкольнай і інклюзіўнай адукацыі. Увазе ўдзельнікаў была прадстаўлена выстаўка «БДПУ — вядучая ўстанова ў сістэме бесперапыннай педагагічнай адукацыі». У рамках працы секцый госці ўніверсітэта таксама азнаёміліся з работай Рэспубліканскага рэсурснага цэнтра інклюзіўнай адукацыі і Цэнтра сучасных методык дашкольнай адукацыі БДПУ.

Варта адзначыць, што на кожнай з трох дыялогавых пляцовак прагучалі выступленні вядучых навукоўцаў БДПУ. Прадстаўнікі ўніверсітэта падрыхтавалі для прысутных пяць дакладаў, якія без перабольшання можна назваць ключавымі. Так, на пасяджэнні секцыі *«Удасканаленне падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў»* на тэму «Тэндэнцыі і напрамкі развіцця бесперапыннай педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» выступіў Старшыня Каардынацыйнага савета па пытаннях бесперапыннай педагагічнай адукацыі, рэктар БДПУ **А.І. Жук**. Аляксандр Іванавіч асвятліў пытанні кластарнага ўзаемадзеяння, узмацнення прак-



(Пачатак. Заканчэнне на стар. 3.)

• Навіны БДПУ

УАДПАВЕДНАСЦІ з рашэннем рэктара БДПУ **А.І. Жука** за плённую працу ў сістэме адукацыі і ў сувязі з Днём ведаў усе штатныя супрацоўнікі ўніверсітэта 3 верасня атрымаюць прэмію ў памеры 100 руб. (прапарцыянальна займаемай стаўцы).

ПЕРШАЕ ў новым навучальным годзе пасяджэнне рэктарата БДПУ адбылося 30 жніўня і было прысвечана гатоўнасці вучэбна-матэрыяльнай базы ўніверсітэта да новага навучальнага года. З дакладам на гэтую тэму перад прысутнымі выступіў прарэктар універсітэта **А.А. Юшчык**.


ПРЫЁМ дакументаў на паступленне ў аспірантуру і дактарантуру БДПУ за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і на платнай аснове ажыццяўляецца да 30 верасня.

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, падаюць дакументы ў аспірантуру і дактарантуру на працягу ўсяго навучальнага года.

З пералікам неабходных дакументаў, патрабаваннямі да абітурыентаў, умовамі допуску да ўступных іспытаў і залічэння ў аспірантуру і дактарантуру можна азнаёміцца на сайце БДПУ, а таксама па адрасе: г. Мінск, вул. Савецкая, 18 (вуч. корпус № 1, каб. 96, 97). Па дадатковую інфармацыю звяртайцеся па тэл.: (8-017) 311-20-57, (8-017) 327-82-04.

• Жыццё БДПУ

З 1-га верасня адасобленае падраздзяленне «Гандлёвы комплекс БДПУ» прадастаўляе зніжку на харчаванне ў памеры 10 % студэнтам (магістрантам, слухачам) дзённай формы атрымання адукацыі, а таксама супрацоўнікам універсітэта. Каб скарыстацца магчымасцю паесці танней, студэнтам неабходна атрымаць картку пакупніка на сваім факультэце/інстытуце, а работнікам універсітэта дастаткова прад'явіць пропуск на ўваход у БДПУ.



Па словах дырэктара Гандлёвага комплексу **Т.І. Ражкаван**, універсітэцкія кафэ і сталовая чакаюць наведвальнікаў з першага дня новага навучальнага года. У пунктах харчавання выкананы якасны касметычны рамонт з выкарыстаннем сучасных будаўнічых матэрыялаў, значна пашыраны асартымент салатаў, сокаў і вырабаў з цеста, што вельмі даспадобы будучым і сённяшнім педагогам.

НАБЛІЖАЕЦЦА да завяршэння кампанія па засяленні ў інтэрнаты Студэнцкага гарадка БДПУ іншагародніх студэнтаў. У іх ліку сёлета 905 першакурснікаў, якіх універсітэт гарантавана забяспечвае месцамі для пражывання ў адным з 8 інтэрнатаў.



Шаноўныя калегі – выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі, выпускнікі БДПУ!



Сардэчна віншую вас з Днём ведаў!

Гэтае свята абʼядноўвае ўсе пакаленні жыхароў нашай краіны: тых, хто вучыць і вучыцца, імкнецца да пастаяннага самаўдасканалення і развівае розныя напрамкі інтэлектуальна-інавацыйнай дзейнасці, пераймае перадавы вопыт і ўкараняе сучасныя тэхналогіі ва ўсе сферы жыцця грамадства. Аднак вялікая сямʼя БДПУ сустракае яго з асабліва ўрачыстым і прыўзнятым настроем. Штогод 1 верасня для нас пачынаецца новы этап цікавай плённай працы. І я ўпэўнены, што назапашаны досвед і бязмежны творчы патэнцыял дапамогуць нашаму згуртаванаму педагагічнаму калектыву і надалей удасканальваць айчынную сістэму адукацыі, рыхтуючы высокакваліфікаваных, кампетэнтных і мабільных спецыялістаў.

Сёлета студэнцкае братэрства нашага ўніверсітэта папоўнілася новай зменай. Паважаныя першакурснікі! Дзякуй за свядомы выбар, высокую матывацыю на педагагічную працу. Жадаю, каб вучоба стала для вас самым запамінальным і прадуктыўным перыядам жыцця, напоўненым радасцю пазнання і сапраўдным сяброўствам. Безумоўна, словы віншавання адрасую ўсім студэнтам БДПУ. Дзякуй за тое, што сваімі ведамі, талентамі, поспехамі ствараеце воблік нашага ўніверсітэта – сучаснага, дынамічнага, прагрэсіўнага.

Цёплыя словы прызнання ў гэты дзень выказваю ўсяму прафесарска-выкладчыцкаму калектыву БДПУ. Вы – аснова і гонар нашага ўніверсітэта, узор адданасці выбранай прафесіі, найлепшы прыклад для пераймання! Няхай агеньчык любові да педагагічнай дзейнасці ніколі не згасае, а толькі сілкуецца поспехамі, дасягненнямі і ўдзячнасцю вашых выхаванцаў.

З Днём ведаў, БДПУ! З пачаткам новага навучальнага года!

Рэктар БДПУ *Жук* **А.І. Жук**


ЛІЧБЫ І ФАКТЫ – НА НАШУ КАРЫСЦЬ!

Падведзены вынікі залічэння абітурыентаў у БДПУ. Сёлетняя ўступная кампанія паказала, што наша ўстанова вельмі папулярная сярод выпускнікоў. Так, на 1160 бюджэтных месцаў (885 – дзённай формы атрымання адукацыі і 275 – завочнай) было пададзена больш чым 2000 заяў. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў каля 2,1 чалавека на месца.



Амаль чвэрць першакурснікаў БДПУ – медалісты і ўладальнікі дыпломаў ССНУ з адзнакай, выпускнікі профільных класаў педагагічнай накіраванасці. Студэнтамі дзённай бюджэтнай формы атрымання адукацыі сталі 232 выпускнікі гімназій і ліцэяў. У прыёмную камісію БДПУ падалі дакументы 209 выпускнікоў педкласаў (у 2020 г. — 197), 114 з якіх скарысталіся правам паступлення без іспытаў па выніках сумоўя. Сярэдні бал іх атэстатаў роўны 8,9. Усяго на першы курс залічаны 203 педкласаўцы. Таксама сёлета звязаць свой далейшы лёс з педагогікай вырашылі 83 медалісты (у 2020 г. — 51), 133 уладальнікі дыпломаў з адзнакай (у 2020 г. — 120).

На 3 спецыяльнасці (з 31) залічаны толькі абітурыенты, якія вызвалены ад здачы іспытаў (медалісты, выпускнікі педкласаў), а таксама мэтавікі. Так, напрыклад, на філалагічным факультэце па спецыяльнасці *«Беларуская мова і літаратура. Замежная мова»* пры плане прыёму 20 чалавек будуць вучыцца 12 выпускнікоў педкласаў і 3 мэтавікі з баламі, вышэйшымі за 300. Аналагічная сітуацыя склалася на шэрагу спецыяльнасцей гістарычнага факультэта і ў Інстытуце інклюзіўнай адукацыі.



На многія спецыяльнасці прахадныя балы значна выраслі. Максімальнае павышэнне зафіксавана на факультэце пачатковай адукацыі на спецыяльнасці *«Пачатковая адукацыя (скарочаны тэрмін навучання)»* — +71 пункт (завочная форма атрымання адукацыі). Таксама заўважны рост назіраецца на спецыяльнасцях факультэтаў прыродазнаўства і эстэтычнай адукацыі, Інстытута псіхалогіі — адпаведна *«Біялогія і геаграфія»* (+41), *«Выяўленчае мастацтва, чарчэнне і народныя мастацкія промыслы»* (+28), *«Псіхалогія»* (+19). Стабільна высокімі застаюцца прахадныя балы на факультэтах з самымі вялікімі наборамі. Так, на факультэце дашкольнай адукацыі пры плане набору 145 чалавек прахадны бал склаў 217. На факультэце пачатковай адукацыі пры наборы 125 чалавек — 264 балы.

Амаль на ўсіх спецыяльнасцях будуць вучыцца студэнты, якія набралі 300 балаў і вышэй. У першую чаргу гэта — *«Гісторыя і сусветная мастацкая культура»*, *«Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка»*, *«Лагапедыя»*, *«Беларуская мова і літаратура»*, *«Псіхалогія»*, *«Практычная псіхалогія»*.

Дарэчы, абітурыенты з самымі высокімі баламі па ўніверсітэце сталі студэнтамі спецыяльнасцей *«Псіхалогія»* (368 і 362) і *«Лагапедыя»* (352 балы). Звыш 300 балаў набралі 115 абітурыентаў, што залічаны на 1-ы курс дзённай бюджэтнай формы; 168 абітурыентаў маюць балы ў дыяпазоне ад 270 да 299 (на 13 больш, чым у мінулым годзе).

Па шэрагу спецыяльнасцей конкурс быў значна вышэйшы за сярэдні па ўніверсітэце. Так, на спецыяльнасць *«Псіхалогія»* ён склаў 5,6 чалавека на месца, а на спецыяльнасць *«Аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура (аздараўленчая)»* — 4,0.

Варта адзначыць, што з кожным годам у БДПУ паступае ўсё больш юнакоў. Так, на факультэце фізічнага выхавання хлопцы складаюць 60 %, на гістарычным факультэце — 56 %, на фізіка-матэматычным — 33 %, а ў цэлым па ўніверсітэце юнакоў больш чым 20 % ад агульнай колькасці тых, хто паступіў.

БДПУ па-ранейшаму выбіраюць спартсмены высокага ўзроўню. Сёлета да нас паступілі 1 майстар спорту міжнароднага класа, 2 майстры спорту, 4 кандыдаты ў майстры спорту, 19 першаразраднікаў. У ліку студэнтаў-першакурснікаў — 2 пераможцы і прызёры чэмпіянатаў Еўропы, 2 пераможцы і прызёры чэмпіянатаў і першынстваў Рэспублікі Беларусь.

На ўмовах аплаты ў БДПУ залічана 945 чалавек (дзённая форма — 384, завочная — 561). На 18 спецыяльнасцей дзённай платнай формы атрымання адукацыі з 29 прыняты абітурыенты з баламі ад 200 і вышэй.

Такім чынам, сёлета адзначаны рост конкурсу і прахадных балаў, што сведчыць пра эфектыўнасць прафарыентацыйнай дзейнасці і працы, накіраванай на павышэнне прэстыжу педагагічнай прафесіі.

Аляксандр КОРЗЮК,
адказны сакратар прыёмнай камісіі

У ДОБРЫ ШЛЯХ – НАСУСТРАЧ МАРЫ!

Рэпутацыю любой навучальнай установы ў значнай ступені фарміруюць яе выхаванцы. З году ў год разумныя, таленавітыя танкаўцы сваімі дасягненнямі ў самых розных сферах – адукацыі, навуцы, грамадскай дзейнасці, творчасці, спорце – умацоўваюць прэстыж *alma mater* і спрыяюць росту цікавасці да яе з боку такіх жа перспектыўных абітурыентаў. Наш універсітэт, які заслужана мае статус вядучай установы педагагічнага профілю, ганарыцца сваімі выпускнікамі і ўскладае вялікія надзеі на тых хлопцаў і дзяўчат, што кожны год прыходзяць ім на змену. Хто яны, першакурснікі, якія сустракаюць 1 верасня са студэнцкім білетам БДПУ ў руках? Прадстаўнікі педагагічных дынастый, залатыя медалісты, трыумфатары спартыўных спаборніцтваў, мэтанакіраваныя выпускнікі педкласаў, адукаваныя спецыялісты з іншых сфер, якія вырашылі засвоіць прафесію настаўніка… Давайце знаёміцца!

Аляксей БАРАВІК з ліку маладых людзей, чыё паступленне ва ўстанову педагагічнай адукацыі звычайна не выклікае дадатковых пытанняў. Хлопец прадстаўляе ажно пятае



пакаленне настаўнікаў у сваёй сям'і. Запачаткаваў дынастыю прапрадзед Аляксея – настаўнік польскай школы, падхапілі яго дзеці і ўнукі, ну а самымі маладымі яе прадаўжальнікамі на сённяшні дзень з'яўляюцца дваюрадныя і траюрадныя браты героя гэтага матэрыялу – студэнта 1-га курса факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій БДПУ.

– Нашу дынастыю складаюць настаўнікі розных спецыяльнасцей, сярод іх і шматлікія прадметнікі (выкладалі хімію, біялогію, гісторыю і інш.), і педагогі, якія праявілі сябе ў сацыяльнай сферы. Маючы такіх сваякоў, немагчыма застацца без пэўнага ўзору, прафесійнага і маральнага арыенціра, натхняльніка. Асабіста для мяне ім стала мая бабуля Любоў Іванаўна Посах – настаўніца рускай мовы і літаратуры, таленавіты і мудры педагог вышэйшай катэгорыі з больш чым 40-гадовым стажам, якая за працоўныя заслугі была ўзнагароджана медалём «У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна». Я цвёрда запомніў яе параду заўсёды шукаць індывідуальны падыход да кожнага вучня і галоўны жыццёвы прынцып – ніколі не здавацца!

Зрэшты, працягнуць дынастыю, абраўшы педагагічную прафесію, я вырашыў не адразу. Мяне прывабліваліі сацыяльныя навукі, і прыродазнаўчыя. Пазней я патлумачыў сам для сябе гэтую цікавасць жаданнем дапамагаць людзям і адчуваць сябе патрэбным, што, на маю думку, вельмі важна: разуменне значнасці сваёй працы прыносіць маральнае задавальненне, а гэта мае выключна станоўчы ўплыў на чалавека. Тыя ж думкі – як быць карысным? чым дапамагчы? чаму навучыць? – займалі мяне і ў сям'і, дзе я быў старэйшым сябрам і дарадцам для двух братоў. Такія роздумы схілілі мяне ў бок педагагічнай прафесіі. Я вырашыў праверыць свае адчуванні падчас вучобы ў профільным класе сталічнай СШ № 32. Паступіў туды з мэтай паспрабаваць свае сілы, а скончыў – з упэўненасцю ў выбары прафесійнага шляху. З улікам сваіх здольнасцей і прыярытэтаў аддаў перавагу вывучэнню сацыяльнай педагогікі. Ну а вызначыцца з установай адукацыі было яшчэ прасцей. Большасць маіх сваякоў-педагогаў – выпускнікі БДПУ, хоць у часы студэнцтва многіх з іх універсітэт насіў іншыя назвы. Да іх станоўчых водгукаў і рэкамендацый я, вядома, і прыслухаўся. Ведаю, што БДПУ – гэта прастора не толькі для адукацыі, але і для творчасці і самаразвіцця, таму з нецярплівасцю чакаю, калі мой жыццёвы гадзіннік пачне адлічваць насычаныя падзеямі дні студэнцкіх гадоў.

***

Ганна ВОЙЦІК, першакурсніца Інстытута інклюзіўнай адукацыі, скончыла ДУА «Гімназія № 1 імя У.А. Караля г. Чэрвеня» з залатым медалём. Ён мог стаць для дзяўчыны пропускам на розныя спецыяльнасці, у той час як будучым лагапедам абавязкова трэба было прайсці выпрабаванне цэнтралізаваным тэсціраваннем. І Ганна не адступілася ад мэты – годна вытрымала іспыты, набраўшы 352 балы, дастатковыя для залічэння на спецыяльнасць *«Лагапедыя»*.

– Яшчэ ў 4-м класе я зразумела, што мне падабаецца дапамагаць людзям. Гэтае жаданне рэалізоўвала падчас вучобы ў школе як умела: тлумачыла аднакласнікам незразумелыя тэмы па розных прадметах, нават добраахвотна давала спісваць, хоць цяпер разумею, што гэта не зусім можна назваць дапамогай. Такое стаўленне прыносіла аддачу, у мяне былі добрыя адносіны з іншымі вучнямі, я адчувала сімпатыю і павагу з іх боку. Гэтым, відаць, і было выклікана першапачатковае імкненне атрымаць прафесію ў Інстытуце псіхалогіі БДПУ. Аднак бацькі – дарэчы, настаўнікі – зацікавілі мяне інфармацыяй пра такую спецыяльнасць, як *«Лагапедыя»*, і ў выніку я не здрадзіла выбару ўніверсітэта, але змяніла напрамак – цяпер я студэнтка Інстытута інклюзіўнай адукацыі.

Шлях да мэты быў няпростым. Мае настаўнікі з радасцю пагадзіліся дапамагчы ў падрыхтоўцы да ЦТ, аднак і падчас самастойных заняткаў я сябе не шкадавала. Сёння разумею: маёй памылкай было жаданне засвойваць усё адразу і ў вялікіх аб'ёмах. Напрыклад, з верасня па лістапад я штодзень рыхтавалася да тэсціравання па трох прадметах. З такім рэжымам хутка стамлялася, кідала заняткі на



няпэўны час, але пазней брала сябе ў рукі і ішла да сваёй мэты. Пасля першага этапу рэпетыцыйнага тэсціравання зразумела, што будзе складана, і знізіла асабістую планку чаканых балаў, якая спачатку была вельмі высокай. Аднак лічбы на сертыфікатах прыемна здзівілі і ўзрадавалі: мае старанні ў выніку матэрыялізаваліся ў 352 балы, дастатковыя для залічэння на выбраную спецыяльнасць.

Ад знаёмых ведаю пра насычанае студэнцкае жыццё ў БДПУ, пра велізарную колькасць мерапрыемстваў, у якіх можна паказаць сябе, і планую па магчымасці паўдзельнічаць у іх. Аднак і пра цяжкасці, з якімі сутыкаецца ці не кожны першакурснік, таксама чула. Таму мне дастаткова трывожна ўступаць у новы, дарослы, этап свайго жыцця – палохае невядомасць. Але я веру, што ўсе мы, першакурснікі, справімся, пераадолеем перашкоды і зможам назапасіць веды і вопыт, каб у наступным годзе дзяліцца імі з пачаткоўцамі.

***

Дзмітрый ТАГАН досыць доўга не мог выбраць, якой прафесіі аддаць перавагу. Яму заўсёды падабаліся хімія і біялогія, аднак некаторыя пераконвалі, што гэтыя навукі не вельмі перспектыўныя ў стагоддзе тэхналогій і праграмавання… Але навучанне ў профільным класе педагагічнай накіраванасці СШ № 2 г. Стоўбцы дапамагло хлопцу вызначыцца з прафесійным шляхам – Дзмітрый цвёрда вырашыў стаць настаўнікам. Цяпер ён – першакурснік факультэта прыродазнаўства БДПУ.



– Перыяд вучобы ў педагагічным класе стаў для мяне лёсавызначальным. Там я атрымаў досыць шырокія веды пра настаўніцкую прафесію, паспрабаваў сябе ў гэтай ролі падчас розных мерапрыемстваў і ўсвядоміў, што менавіта такі выбар бачыцца мне правільным. А галоўнае – зрабіў важны крок на шляху да мары, атрымаў свой шанц стаць тым, кім хачу: чалавекам, які ўсяму навучыць і заўсёды дапаможа, стане сябрам і дарадцам для кожнага дзіцяці і важнай асобай для ўсяго грамадства.

На выбар універсітэта паўплывала рэпутацыя БДПУ: ён з'яўляецца самай прэстыжнай установай педагагічнай адукацыі ў нашай краіне, мае багатую гісторыю і лепшыя ўмовы для навучання і пражывання студэнтаў. Да таго ж неаднойчы даводзілася чуць ад выпускнікоў-танкаўцаў, што студэнцкія гады пакінулі адны з самых яскравых успамінаў у жыцці. Спадзяюся, што калісьці і я таксама падтрымаю гэтую думку. У чаканні новага этапу ні кроплі не хвалююся – зусім не! Я пазнаёміўся ўжо са значнай часткай свайго курса і буду рады пабачыцца з імі ў аўдыторыях. Вельмі хачу хутчэй прыступіць да вучобы і адчуць студэнцкае жыццё напоўніцу. Думаю, універсітэцкія гады дапамогуць мне развіць свае здольнасці ў вывучэнні хіміі, а галоўнае – паспрыяюць майму станаўленню як усебакова развітой, гарманічнай асобы.

***

Руслан ГАЛАВАЧОЎ – хлопец мэтанакіраваны. З 7-га па 11-ы клас ён быў навучэнцам Рэспубліканскага вучылішча алімпійскага рэзерву, а пасля заканчэння ўстановы там жа атрымаў дыплом трэнера па дзюдо. Сур'ёзныя перамогі на рэспубліканскай і міжнароднай арэне дапамаглі Руслану не толькі здабыць славу таленавітага спартсмена, але і атрымаць студэнцкі білет БДПУ: на факультэце фізічнага выхавання перспектыўнае папаўненне!

– Маё жыццё цесна звязана са спортам: я чэмпіён Беларусі, пераможца і прызёр кубкаў Еўропы па дзюдо, а таксама прызёр пер-



шынства Еўропы і свету па самба. Цяпер мяне ў большай ступені займаюць спартыўныя выступленні, але адзначаю цікавасць да трэнерскай дзейнасці і бачу ў гэтым прафесійную перспектыву. Калі я бываю ў сваім родным горадзе Оршы, трэнер дае мне магчымасць праводзіць заняткі, паказваць прыёмы маленькім дзецям. Мне вельмі падабаецца вучыць, тлумачыць, перадаваць вопыт падрастаючаму пакаленню. Думаю, з гэтай справай магу звязаць сваю будучыню, і вучоба ў педагагічным універсітэце стане важным этапам на выбраным шляху.

Спартыўныя дасягненні дазволілі мне стаць студэнтам БДПУ без уступных экзаменаў. Для паступлення я разглядаў яшчэ адзін відавочны варыянт – БДУФК, і давялося рабіць выбар. Сярод маіх сяброў ёсць выпускнікі факультэта фізічнага выхавання. Адзін з іх – майстар спорту міжнароднага класа **Аляксандр Сідорык** – часта расказваў пра вучобу ва ўніверсітэце, раіў аддаць перавагу БДПУ. Такую ж параду даў і мой трэнер, адзначыўшы сур'ёзныя адукацыйныя і бытавыя перавагі. Даверыўшыся іх рэкамендацыям, я выбраў спецыяльнасць *«Аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура (аздараўленчая)»* і стаў студэнтам ФФВ. З гэтым факультэтам звязаны мае планы на бліжэйшыя гады – вучоба, трэніроўкі і самаразвіццё. Студэнты БДПУ паспяхова ўдзельнічаюць у шматлікіх спаборніцтвах па самба і дзюдо, і я планую адстойваць гонар сваёй *alma mater* не толькі на рэспубліканскім узроўні, але і на міжнароднай спартыўнай арэне. Думаю, што час вучобы прынясе многа станоўчых і запамінальных момантаў. Я гатовы да новых знаёмстваў, да новых ведаў і да новых перамог. Настрой баявы!

***

У адрозненне ад першакурснікаў, з якімі мы пазнаёміліся вышэй, **Людміла ШАРЫКІНА**, студэнтка факультэта дашкольнай адукацыі, не па чутках ведае, што такое ўступная кампа-



нія, залікі, экзамены і г. д. Яна ўжо мае дыплом выпускніцы факультэта бухгалтарскага ўліку Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і вопыт працы па спецыяльнасці *«Фінансы і крэдыт»*. Аднак Людміла – з тых смелых людзей, якія кіруюцца ўнутраным адчуваннем прафесійнага паклікання. Таму яе жыццёвая дарога збочыла ў напрамку другой – педагагічнай – адукацыі.

– Я скончыла школу ў 1999 годзе – у тыя часы, калі эканамічныя спецыяльнасці былі запатрабаванымі і вельмі папулярнымі ў абітурыентаў, таму ў момант выбару прафесіі сумненняў у мяне не было. Не ўзнікала іх і ў студэнцкія гады: вучыцца было лёгка і цікава. Разуменне таго, што я памылілася, прыйшло пазней, падчас працы па спецыяльнасці. На жаль, мне спатрэбілася досыць многа часу, каб зразумець гэта і наважыцца на кардынальныя перамены.

У мінулым годзе мая сям'я пераехала ў Мінск з раённага цэнтра, і мне давялося шукаць новае месца работы. Жаданне працаваць па спецыяльнасці не было, і ў такі пераломны момант я нечакана для сябе самой вырашыла здзейсніць даўнюю дзіцячую мару – стаць педагогам. Адгукнуўшыся на прапановы некалькіх устаноў дашкольнай адукацыі, у выніку ўладкавалася ў яслі-сад № 499 на пасаду выхавацеля. І вось працую тут ужо год. Нягледзячы на тое што асвойваць новую прафесію давялося практычна з нуля, не пашкадавала пра свой выбар. Вельмі ўдзячная кіраўніцтву за тое, што паверылі ў мяне і далі магчымасць займацца тым, што мне сапраўды падабаецца. Хацелася б дасягнуць максімальна магчымых поспехаў у новай сферы, таму на дадзены момант маёй асноўнай мэтай з'яўляецца завочнае атрыманне адпаведнай педагагічнай адукацыі. Не сакрэт, што, каб стаць добрым спецыялістам, акрамя практычнага вопыту неабходна выдатна валодаць і тэарэтычнымі ведамі. Ведаю, што ў БДПУ рыхтуюць высокакваліфікаваных спецыялістаў педагагічнага напрамку, і ўпэўнена, што дасведчаныя выкладчыкі ўніверсітэта дапамогуць мне ў авалоданні любімай прафесіяй.

***

Такія розныя, але такія падобныя ў сваіх імкненнях і марах першакурснікі 2021 г. – і тыя, хто падзяліўся ўжо сваімі гісторыямі на старонках «Н», і тыя, з кім нам яшчэ давядзецца пазнаёміцца ў вучэбных аўдыторыях і канферэнц-залах, на сцэне і спартыўным стадыёне… Шчыра жадаем поспехаў і спадзяёмся, што іх дасягненні яшчэ не раз стануць нагодай для публікацый. У добры шлях!

Падрыхтавала Ірына МЯЦЕЛІЦА

● Афіцыйная хроніка

ПЕДСАВЕТ НАЙВЫШЭЙШАГА ЎЗРОЎНЮ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1.)



тыкаарыентаванасці падрыхтоўкі (арганізацыя і новы змест педагагічнай практыкі), рэалізацыі прынцыпу інклюзіі ў адукацыі, ідэй адукацыі для ўстойлівага развіцця і інш.

Даклад «Арганізацыя і навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці профільных класаў педагагічнай накіраванасці: беларуская мадэль» калегам прадставіла начальнік цэнтра развіцця педагагічнай адукацыі БДПУ **Аляксандра Валянцінаўна Позняк**.

Прынцып інклюзіі ў навучанні дзяцей уваходзіць у галоўныя сусветныя трэнды, і БДПУ актыўна працуе ў гэтым кірунку. Наш універсітэт з'яўляецца базавай арганізацыяй СНД па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне спецыяльнай і інклюзіўнай адукацыі. Таму ў рамках секцыі *«Інклюзія: роўныя магчымасці для кожнага ў адкрытай адукацыйнай прасторы»* асноўным без сумневу быў даклад дырэктара Інстытута інклюзіўнай адукацыі **Веры Валер'еўны Хітрук** «Падрыхтоўка педагагічных кадраў для працы ва ўмовах інклюзіўнай адукацыі».

Прадстаўнікі БДПУ таксама выступілі перад удзельнікамі дыскусійнай пляцоўкі *«Сучасныя падыходы да павышэння якасці дашкольнай адукацыі: вопыт, праблемы, перспектывы»*. Непадробную цікавасць у слухачоў выклікалі даклады «Напрамкі дзейнасці Цэнтра сучасных методык дашкольнай адукацыі» дэкана факультэта дашкольнай адукацыі **Вольгі Мікалаеўны Анцыпіровіч** і «Рэалізацыя навуковых і гуманітарных праектаў у сферы дашкольнай адукацыі: арганізацыя работы ўстаноў дашкольнай адукацыі па рэалізацыі ранняй дапамогі дзецям групы рызыкі» загадчыка навукова-даследчага сектара **Алены Іванаўны Смолер**.

Па выніках зацікаўленага і канструктыўнага абмеркавання шэрагу тэм удзельнікі секцый выказалі прапановы і рэкамендацыі, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў адпаведных рэзалюцыях.

Наш кар.

IT-ЛЕТА ДЛЯ ДАПЫТЛІВЫХ

За адносна непрацяглы час існавання (з 2017 г.) на базе Рэспубліканскага рэсурснага цэнтра адукацыйнай робататэхнікі, створанага на фізіка-матэматычным факультэце, было праведзена шмат мерапрыемстваў для школьнікаў, студэнтаў, выкладчыкаў і настаўнікаў. Большасць з іх ладзілася падчас навучальнага года, аднак сёлета адміністрацыя ўніверсітэта выказала прапанову, што летнія вакацыі таксама можна правесці з карысцю для развіцця тэхнічна-крэатыўных навыкаў і ўменняў. Так з'явілася ідэя арганізацыі праекта «*IT*-лета», якая была паспяхова ўвасоблена ў жыццё.

Супрацоўніцтва са школамі горада дазволіла задзейнічаць у экскурсіях і забаўляльна-пазнавальных занятках вучняў з першага па сёмы класы. Такая разбежка сведчыць пра тое, што праграмаванне і робататэхніка цікавыя для дзяцей любога ўзросту. Для малодшых школьнікаў заняткі праводзіліся ў гульнёва-забаўляльнай форме. Увогуле праграмаванне для іх — як таемная магія: задаеш некалькі радкоў з адмысловымі сімваламі — і вось робат-памочнік ажывае, выконвае патрэбныя каманды. Вучні сярэдняй школы атрымалі шанц паспрабаваць свае сілы ў больш сур'ёзнай сферы прафесійнай распрацоўкі. Гэта было галоўнай задачай нашых азнаямляльных экскурсій-заняткаў у межах праекта «*IT*-лета». Таксама мы паказалі школьнікам, што дастаткова сур'ёзная сфера праграмавання можа быць займальным, цікавым і нескладаным заняткам, даступным фактычна ўсім, што гэта свайго роду мастацтва. Нездарма самая вядомая кніга ў сферы камп'ютарных





тэхналогій называецца «Мастацтва праграмавання» (аўтар — Дональд Кнут).

За час ажыццяўлення праекта рэсурсны цэнтр наведала каля 50 навучэнцаў сталічных сярэдніх школ № 123, 129, 189. Дзеці засталіся пад уражаннем: яны пазнаёміліся з візуальнымі асяроддзямі для распрацоўкі 2D і 3D гульняў, з робататэхнічнымі канструктарамі, змаглі сабраць робата-брамніка і напісаць сваю першую гульню «Гонкі». Заняткі праводзіліся мною і маёй калегай — выкладчыкам кафедры інфарматыкі і методыкі выкладання інфарматыкі **Крысцінай Іванаўнай Казлоўскай**.

З упэўненасцю можна сказаць, што вопыт ажыццяўлення праекта аказаўся паспяховым, яго варта пашырыць на правядзенне круглагадовых заняткаў з навучэнцамі школ горада.

Аляксандр КУТЫШ,
намеснік дэкана па вучэбнай рабоце фізіка-матэматычнага факультэта

МАРШРУТ АДЗІНСТВА, ЗГОДЫ І НАТХНЕННЯ

Група студэнтаў БДПУ ў складзе Мікіты Рачылоўскага (кіраўнік дэлегацыі ад Мінска і Мінскай вобласці), Мікіты Кузуры, Дар'і Мядзведзевай, Кацярыны Андрукевіч, Лізаветы Цішэвіч, Ксеніі Скачко прынялі ўдзел у праекце «Рэспубліканскі маладзёжны цягнік #БеларусьМоладзьАдзінства». Мерапрыемства стартавала 14 ліпеня ў Гродне – маладзёжнай сталіцы-2021. За сем дзён актывісты наведалі восем гарадоў, пераадолеўшы каля 2 тыс. кіламетраў. Гэта – Гродна, Полацк, Віцебск, Горкі, Петрыкаў, Брэст, Мар'іна Горка, Мінск. Танкаўцы прынялі ўдзел у рэалізацыі сацыяльна значных ініцыятыў, у працоўных акцыях па добраўпарадкаванні тэрыторыі Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра, мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», у шэрагу праграм, азнаёміліся з выдатнымі мясцінамі, падчас адкрытых дыялогаў абмеркавалі актуальныя пытанні маладзёжнай палітыкі з прадстаўнікамі рэгіёнаў і органаў дзяржаўнага кіравання.

На плошчы Дзяржаўнага сцяга 22 ліпеня адбылася ўрачыстая цырымонія завяршэння маршруту Рэспубліканскага маладзёжнага цягніка. Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь **І.В. Карпенка** уручыў удзельнікам праекта адпаведныя сертыфікаты. Дэлегаты падзяліліся з чытачамі «Н» уражаннямі ад удзелу ў мерапрыемстве.



Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ, студэнт 4-га курса гістарычнага факультэта:

— Мабыць, варта пачаць крыху здалёк. Маё знаёмства з праектам адбылося яшчэ ў ліпені мінулага года падчас урачыстай цырымоніі ўскладання кветак да стэлы «Мінск — горад-герой» з нагоды завяршэння маршруту маладзёжнага цягніка-2020, які праходзіў пад дэвізам #БеларусьМоладзьНатхненне. Менавіта тады вырашыў абавязкова стаць яго ўдзельнікам. І, як толькі даведаўся, што адкрываецца рэгістрацыя, адразу ж падаў заяўку. У выніку маю кандыдатуру не толькі адобрылі, але і прызначылі мяне кіраўніком дэлегацыі ад Мінска і Мінскай вобласці.

За час, праведзены ў дарозе, у маладзёжным цягніку ўсталявалася таварыская атмасфера. Асабліва гэта адчувалася ў стасунках паміж членамі дэлегацыі БДПУ. Мы сталі насамрэч моцнай камандай. Нават пасля насычанага дня збіраліся ў купэ і абмяркоўвалі падзеі. Грукаталі колы цягніка, за вокнамі змяняліся краявіды, а мы пад гарбату смяяліся, узгадвалі моманты са студэнцкага жыцця, дзяліліся думкамі. За тыдзень падарожжа нам пашчасціла ўбачыць розныя куткі нашай цудоўнай краіны, дзе раней не даводзілася бываць. Асабіста мне запаў у душу горад Петрыкаў. Надзіва прыгожае месца, жамчужына Палесся. У адной з вёсак гэтага раёна нарадзіўся легендарны народны герой Беларусі дзед Талаш. Таксама вельмі спадабаўся цэнтр Брэста — вуліца Савецкая, дзе кожны вечар у строга адведзены час ліхтаршчык у старадаўнім мундзіры запальвае ўручную ліхтары з газавымі лямпамі. Вельмі рады, што атрымаў магчымасць паўдзельнічаць у праекце, пазнаёміцца з цікавымі людзьмі, разам з іншымі танкаўцамі годна прадставіць беларускую моладзь, родны ўніверсітэт, прадэманстраваць сваю грамадзянскую пазіцыю.

Дар'я МЯДЗВЕДЗЕВА, студэнтка 2-га курса факультэта пачатковай адукацыі:

— Вельмі прыемна было штодня адчуваць сябе ганаровымі гасцямі новага горада. Як цёпла нас сустракалі на кожным прыпынку! Маладзёжны цягнік стаў для мяне штуршком да зацікаўленага вывучэння нашай утульнай, гасціннай Беларусі. Падчас падарожжа мне, будучай настаўніцы пачатковых класаў, больш за ўсё запомнілася наведванне дзіцячага дома сямейнага тыпу ў Брэсце. Там мы пазнаёміліся з яго выхаванцамі, абмяняліся падарункамі і пакінулі часцінку свайго цяпла дзеткам.

Асабліва натхняльнымі для мяне сталі адкрытыя дыялогі, падчас якіх паступова фармуляваўся адказ на пытанне: «Якая яна, моладзь XXI стагоддзя?». Мы — адкрытыя, рознабаковыя, энергічныя, талерантныя, крэатыўныя, і толькі ад нас залежыць будучыня роднай Беларусі. Мару вярнуцца ў праект!

Дарэчы, красамоўныя аповеды пра ўбачанае натхнілі на падарожжы і маю сям'ю — разам мы ўжо наведалі аграгарадок Азарычы.

Лізавета ЦІШЭВІЧ, студэнтка 2-га курса фізіка-матэматычнага факультэта:

— Рэспубліканскі маладзёжны цягнік падарыў мне мора станоўчых эмоцый і ўражанняў на доўгі час. Вельмі рада, што падчас праекта пазнаёмілася з найпрыгажэйшымі куткамі нашай цудоўнай краіны, з цікавымі людзьмі, некаторыя з якіх сталі для мяне сябрамі. Найбольш запомнілася Гродна — маладзёжная сталіца Беларусі ў 2021 г. Менавіта ў гэтым горадзе пачалося наша незабыўнае падарожжа па Беларусі, тут нам уручылі Рэспубліканскі сцяг, які мы правезлі праз усю краіну. Менавіта ў Гродне я змагла ажыццявіць сваю маленькую мару — пагладзіць альпака ў заапарку, дзе мы займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі. Спадзяюся, што ў наступным годзе цягнік праедзе па іншым маршруце, каб моладзь убачыла ўсю прыгажосць нашай краіны.

Кацярына АНДРУКЕВІЧ, студэнтка 3-га курса факультэта пачатковай адукацыі:

— Колькі эмоцый давялося перажыць — немагчыма апісаць! Гэты праект стаў для мяне чароўнай прыгодай даўжынёю ў 8 дзён. Ён дапамог пазнаёміцца з цудоўнымі людзьмі, атрымаць новыя веды і вопыт, убачыць знакамітыя месцы і нават звярнуцца да міністра адукацыі з пытаннем!

Усе гарады нашай квітнеючай краіны па-свойму прыгожыя. У гэтым няма сумневу. Аднак у сэрца мне запаў маленькі, але вельмі



натхняльны горад Горкі. Нам выпала магчымасць наведаць там конную школу і нават пакатацца верхам на скакуне. Дагэтуль не магу стрымаць эмоцый! Гэта горад, з якога асабіста мне сапраўды не хацелася з'язджаць і які таксама шчыра не хацеў нас адпускаць.

Праект зарадзіў пазітывам, надаў сіл на гады наперад. Спадзяюся, бяру ў ім удзел не апошні раз!

● Аддзел кадраў

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне пасад педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу з заключэннем кантракта на тэрмін, вызначаны наймальнікам:

загадчыкаў кафедраў (д.н., к.н., 13 разр.) сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, спецыяльнай педагогікі;

дацэнтаў кафедраў (к.н., 11 разр.) беларускага і рускага мовазнаўства, методык дашкольнай адукацыі;

старшых выкладчыкаў кафедраў (10 разр.) мастацка-педагагічнай адукацыі (2), методык дашкольнай адукацыі, сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі;

выкладчыка кафедры (9 разр.) педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі.

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы. Дакументы прымаюцца ў аддзеле кадраў па адрасе: вул. Савецкая, 18/1, г. Мінск. Тэл. 311-21-05.

● Служба 103

Вакцынацыя студэнтаў БДПУ супраць інфекцыі COVID-19 ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Нацыянальным планам мерапрыемстваў па вакцынацыі на 2021/2022 гг. паэтапна і на бясплатнай аснове.

Пасля такой медыцынскай маніпуляцыі выпрацоўваюцца антыцелы супраць SARS-CoV-2, што садзейнічае прадухіленню заражэння, засцерагае ад развіцця цяжкіх і ўскладненых формаў цячэння хваробы.

Мэтай вакцынацыі з'яўляецца фарміраванне папуляцыйнага імунітэту, папярэджванне захворвання і распаўсюджвання інфекцыі.

Усе, хто жадае прышчапіцца ад COVID-19, могуць звярнуцца ў 33-ю гарадскую студэнцкую паліклініку (каб. 216) з 8.00 да 19.00. Тэл. для даведак 8(017) 379-40-43.

Студэнты, якія пражываюць у Студэнцкай вёсцы, могуць прайсці вакцынацыю ў амбулаторыі паліклінікі па адрасе: вул. Чурлёніса, 1. Тэл. для даведак: 8(017) 377-18-22.

Алена ДУБРОЎСКАЯ,
загадчык здраўпункта № 1

ПЕДАГАГІЧНАЕ АБЛІЧЧА ПРЫГАЖОСЦІ

Студэнткі нашага ўніверсітэта вызначаюцца не толькі выдатнымі інтэлектуальнымі здольнасцямі, але і адметным знешнім ды ўнутраным хараством. Гэтая якасць была неаднаразова ацэнена журы разнастайных конкурсаў. Бягучы год не стаў выключэннем. Па выніках рэгіянальных этапаў у фінал XII Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь» прайшлі 30 удзельніц, у тым ліку – дзве прадстаўніцы БДПУ. Імя пераможцы стане вядомым зусім хутка – 10 верасня, а мы пакуль пазнаёмімся з нашымі дзяўчатамі – прэтэндэнткамі на ганаровы тытул.

Яна БАГДАНОВІЧ, студэнтка 4-га курса факультэта эстэтычнай адукацыі (завочная форма атрымання адукацыі):



– Я жыву ў горадзе Смаргонь Гродзенскай вобласці, навучаюся па класе гітары ў старшага выкладчыка кафедры музычна-педагагічнай адукацыі **Кірыла Алегавіча Успенскага**. Вось ужо чатыры гады працую ў Сольскай дзіцячай школе мастацтваў, дзе выкладаю музычны інструмент (балалайка). Акрамя таго, займаюся харэаграфіяй з дашкольнікамі ў аграгарадку Асінаўшчызна. Праца з дзецьмі прыносіць мне задавальненне: лёгка і хутка знаходжу з імі агульную мову. Вольны час аддаю фатаграфіі, люблю здымаць усё прыгожае: людзей, жывёл, прыроду.

На кастынг «Міс Беларусь» упершыню прыйшла ў лютым 2020-га, аднак з-за пандэміі яго правядзенне перанеслі на 2021 год. Вядома, як і іншыя дзяўчаты, хвалявалася падчас самапрэзентацыі. Перад маім выхадам члены журы даведаліся, што я іграю на музычным інструменце, і папрасілі выканаць любімы твор. Выступленне ім вельмі спадабалася, прысутныя апладзіравалі, нехта крыкнуў «брава!»... Падтрымка журы, безумоўна, надала мне больш упэўненасці, узняла настрой, усяліла надзею. Гэты момант надоўга застанецца ў памяці.

Сёння я ўваходжу ў трыццатку фіналістак конкурсу і ўдзельнічаю ў падрыхтоўча-рэпетыцыйным працэсе, які ўключае правядзенне фотасесій, пастаноўку дэфіле, заняткі харэаграфіяй. Для мяне тут усё новае, бо я ніколі не мела дачынення да мадэльнага бізнесу. Хоць, шчыра прызнаюся, заўсёды пра гэта марыла і хацела паспрабаваць сябе ў такім кірунку.

Акрамя падрыхтоўкі да конкурсу для фіналістак арганізуюцца экскурсіі. Яны вельмі ўпрыгожваюць наш вольны час, зараджаюць аптымізмам, дапамагаюць бліжэй пазнаёміцца паміж сабой і пасябраваць. Усе дзяўчаты на самай справе вельмі прыгожыя, і суддзям будзе няпроста выбраць пераможцу гэтага шоу.

Што да мяне, то ўваход у трыццатку фіналістак – гэта ўжо вялікая перамога! Усім канкурсанткам жадаю поспеху, цярплівасці і ўпэўненасці, каб прайсці намечаны шлях!

Марыя ЧАЧКО, студэнтка 4-га курса факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій (спецыяльнасць *«Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога»*):

– Ад конкурсу чакаю толькі самых станоўчых эмоцый і натхнення. Спадзяюся на перамогу ў першую чаргу над сабой. Я вельмі мэтанакіраваны і творчы чалавек, іду па жыцці з дэвізам «Ніколі не здавацца!». У мяне шмат захапленняў: харэаграфія, малюнак, спорт. Што да апошняга, то някепска страляю з пнеўматычнай вінтоўкі і гуляю ў баскетбол (выступаю за зборную факультэта). Яшчэ займаюся акцёрскім майстэрствам у народным тэатры «Тайм».



Для мяне важна жыць сэрцам. Таму не забываю пра дабрачынную і валанцёрскую дзейнасць. Імкнуся дапамагаць людзям і рабіць добрыя справы. Калі бачу, што дзякуючы маім старанням чалавеку стала лепш, то адчуваю сябе больш шчаслівай. Рэалізую ўласны сацыяльны праект «Голас сэрца», у рамках якога выступаю на сцэне разам з выхаванцамі дамоў-інтэрнатаў.

Люблю жыццё і ўмею яму радавацца! Напаўняю будні прыемнымі падзеямі і сустрэчамі з цікавымі людзьмі. Я – «Міс ФСПТ-2018» і дзякуючы гэтаму тытулу прадстаўляла свой факультэт на ўніверсітэцкім конкурсе «Міс БДПУ»; з'яўлялася дэбютанткай Венскага балю-2019. На сцэне *alma mater* часта выступаю ў ролі вядучай. Увогуле ў мяне ёсць дзіцячая мара прысвяціць сваё жыццё сцэне. Многія скажуць, што гэта вельмі банальна. Аднак я веру і ведаю, што ў мяне ўсё атрымаецца.


Пажадаем дзяўчатам, каб у іх сапраўды ўсё атрымалася – і падчас конкурсу, і ўвогуле ў жыцці!

ВАЖКІ НАБЫТАК ДЛЯ БУДУЧАЙ ПРАФЕСІІ

Сёлета 35 студэнцкіх атрадаў БДПУ агульнай колькасцю больш за 570 чалавек працавалі ў летніках, санаторыях, спартыўна-аздараўленчых комплексах Мінскай і Віцебскай абласцей, у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня», рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Жамчужына», а таксама ў інтэрнатах БДПУ. Падрыхтоўка ўдзельнікаў педагагічных атрадаў да трэцяга працоўнага семестра пачалася яшчэ ўвесну. Так, студэнты прайшлі навучанне ў «Школе важацкага майстэрства». Сёння яны з захапленнем расказваюць пра свой педагагічны вопыт, які, безумоўна, стане важкім набыткам у скарбонцы будучай прафесійнай дзейнасці.

Крысціна ІГНАТЧЫК, студэнтка факультэта пачатковай адукацыі, атрад «Данка»:

– Летняя педагагічная практыка – важны этап, які павінен прайсці кожны з нас на шляху да свайго прафесійнага станаўлення. Для будучых педагогаў была арганізавана «Школа важацкага майстэрства» пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі факультэта пачатковай адукацыі **Ірыны Іванаўны Забаўскай**. Студэнты даведаліся, як паводзіць сябе ў той ці іншай сітуацыі, якія мерапрыемствы арганізоўваць для дзяцей рознага ўзросту і многае іншае, што вельмі спатрэбілася ў працы. Адбыліся інструктажы па тэхніцы бяспекі, правільных дзеяннях пры надзвычайных сітуацыях.



Удзельнікі педагагічнага атрада «Данка» наведвалі ДУА «Спецыяльная агульнаадукацыйная школа № 18 г. Мінска для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення». Студэнты правялі шмат мерапрыемстваў, у тым ліку квэст-гульню «Партызанскімі сцежкамі», падчас якой дзеці пачулі аповеды пра вайну і выканалі шэраг заданняў. Акрамя таго былі рэалізаваны праекты «Шахматны клуб», «Падаруем другое жыццё непатрэбным рэчам», кірмаш «Масленіца». Падчас квэст-гульні «Веснікі вясны» валанцёры пазнаёмілі дзяцей з птушкамі Беларусі, распавялі пра тое, на якія атрады яны падзяляюцца. Атрыманыя веды, досвед зносін з дзецьмі і правядзення мерапрыемстваў дапамаглі студэнтам у працы ў летніку «Лясны», далі штуршок да асобаснага развіцця. Наперадзе ў нас – гадавая вытворчая практыка, і гэта сапраўды ўнікальная магчымасць праявіць свае лепшыя ўменні і навыкі ў педагагічнай сферы.

Дзіяна КАСПЯРОВІЧ, студэнтка факультэта дашкольнай адукацыі, камандзір студэнцкага педагагічнага атрада «Медуніца»:

– Праца важатым – гэта вельмі адказна і займальна адначасова! У «Зубраня» я прыехала ў другі раз. У мінулым годзе, першакурсніцай, завітала туды ўпершыню. Таму сёлета прыкладна ведала, што мяне чакае, і была падрыхтавана. Найперш дзякуючы навучальнаму курсу «Арганізацыя працы ў аздараўленчым летніку» на базе факультэта дашкольнай адукацыі. Яго для нас праводзіла старшы выкладчык кафедры агульнай і дашкольнай педагогікі **Ірына Анатольеўна Зыкава**. Падчас заняткаў мы пазнаёміліся з асаблівасцямі працы ў аздараўленчым летніку, асновамі фарміравання дзіцячага калектыву, арганізацыяй вольнага часу падапечных, а таксама даведаліся пра тое, як правільна будаваць зносіны з бацькамі выхаванцаў, адміністрацыяй, калегамі. Кожны склаў уласнае партфоліа спецыяліста з канспектамі мерапрыемстваў, гульняў, гутарак і іншымі неабходнымі для працы матэрыяламі. Усё гэта мне спатрэбілася! Дзякуючы курсам на ФДА праца ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Зубраня» прайшла выдатна, лёгка і весела. І педагагічны атрад «Медуніца», камандзірам якога я з'яўлялася, быў адзначаны Падзякай адміністрацыі лагера.

Сваімі ўражаннямі падзяліліся ўдзельнікі студэнцкага педагагічнага атрада факультэта прыродазнаўства «Яст*R*абяты» (куратар – **Наталля Валер'еўна Ястрабава**, спецыяліст па працы са студэнтамі вучэбна-метадычнай лабараторыі інфармацыйных тэхналогій у прыродазнаўчанавуковай адукацыі).

Алена ЧУБУКІНА, камандзір СПА «Яст*R*абяты»:

– Дзякуючы педагагічнаму атраду я здабыла новыя веды і навыкі, знайшла сяброў і атрымала мора станоўчых эмоцый. Калі ёсць згуртаваная каманда, праца ідзе нашмат прасцей. А праца з дзецьмі адначасова вельмі цікавая і цяжкая, таму ўзаемная падтрымка ў нас заўсёды на першым месцы. Гэта мой другі год у атрадзе, і, нягледзячы на тое што склад нашай каманды змяніўся, мы імкнёмся быць на вышыні і з задавальненнем пераймаем вопыт нашых папярэднікаў. У летнік да дзяцей хочацца вяртацца зноў і зноў!

Дыяна КОРШУН, баец СПА:

– Першы вопыт работы ў летніку я разглядаю як сапраўдны старт далейшага развіцця. Дзякуючы педагагічнаму атраду «Яст*R*абяты» я набыла карысныя веды, папрацавала ў складзе выдатнага калектыву. Усе былі спагадлівыя, адкрытыя да ўзаемадзеяння.

Вікторыя КАТАМАХІНА, баец СПА:

– Працаваць самастойна аказалася, вядома, больш складана, чым меркавалася спачатку, але ўсё ж мы змаглі агульнымі намаганнямі пераадолець усе нягоды. Хачу сказаць, што спагадлівасць дзяцей і іх гатоўнасць супрацоўнічаць – галоўныя падарункі для выхавацеля. Бачыць радасныя твары падапечных – самае важнае дасягненне. Вельмі ўдзячна БДПУ за магчымасць праявіць сябе на педагагічнай ніве.

Крысціна БЫБЫК, баец СПА:

– Век жыві – век вучыся. З кожным годам у працы з дзецьмі набываеш новыя веды і абсалютна розныя навыкі. З якімі б цяжкасцямі я ні сутыкалася, заўсёды ўпэўнена, што мяне падтрымаюць «Яст*R*абяты». Важную ролю ў працы з дзецьмі адыгрывае эмацыйны стан выхавацеля, таму ў нас заўсёды пануе пазітыўны настрой.

Асаблівасцю лета-2021 стала стварэнне першага студэнцкага сэрвіснага атрада БДПУ «Сэрвіс+», удзельнікі якога ў ліпені наводзілі парадак у інтэрнатах і на прылеглых да іх тэрыторыях. У будынках рабілі касметычны рамонт месцаў агульнага карыстання (пакоі самападрыхтоўкі, трэнажорныя залы, кухні, калідоры, лесвічныя пралёты), выконвалі частковы рамонт жылых пакояў (фарбавалі плінтусы, наклейвалі шпалеры), займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторый (праполка клумбаў, санітарнае абрэзванне дрэў і кустоўя) і інш.



Сёлета сваё паўналецце – 18-годдзе – адзначыў валанцёрскі праект «Дзеці сталіцы». Гэтым летам больш за 50 студэнтаўтанкаўцаў арганізоўвалі вольны час дзяцей і падлеткаў на базе 6 сталічных школ 5 адміністрацыйных раёнаў г. Мінска: Маскоўскага, Кастрычніцкага, Фрунзенскага, Ленінскага і Савецкага. На працягу ліпеня студэнты праводзілі пазнавальныя квэсты і віктарыны, музычна-забаўляльныя флэшмобы і майстаркласы, беларускія народныя і спартыўныя гульні і іншыя цікавыя мерапрыемствы для дзяцей рознага ўзросту, у тым ліку і цяжкіх падлеткаў, якія бавяць лета ў горадзе.

Усе студэнты справіліся з пастаўленымі перад імі задачамі і правялі лета выдатна!

Алеся РУБАНІК,
загадчык сектара УВРзМ

НАСТАЎНІК
Заснавальнік — Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».
Пасв. аб рэгістр. № 557.

Пр. Незалежнасці, 1, п. 207А, 220030, Мінск.
8-017-226-40-19
nastaunik__news
e-mail: nastaunik@bspu.by
https://nastaunik.bspu.by

Выходзіць два разы ў месяц на беларускай мове.
Аб'ём 4 паласы фармату А3.
Распаўсюджваецца ў вучэбных карпусах і інтэрнатах БДПУ бясплатна.

Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014.
Вул. В. Харужай, 13/61, Мінск, 220123.
Тыраж 500 экз. Заказ 854.
Падпісана ў друк 31.08.2021.

Рэдактар
Т. А. БАШМАКОВА